Гаўрылаў І.

# МУЖНАСЦЬ АФІЦЭРА

На тэрыторыі калгаса "Праўда" Касцюковіцкага раёна ёсць вёска Машавое. У 1909 годзе тут нарадзіўся Феадосій Міхайлавіч Аўхачоў. Людзі старэйшага пакалення ведаюць яго як простага, сціплага чалавека.

З 1934 года Феадосій Міхайлавіч знаходзіўся ў радах Савецкай Арміі, а калі пачалася Вялікая Айчынная вайна, ён адным з першых у сваёй вайсковай часці падаў заяву з просьбай накіраваць яго на фронт, каб біць ворага, каб помсціць за кроў і слёзы людзей, за спаленыя фашыстамі гарады і вёскі роднай Магілёўшчыны.

Камуніст Ф. М. Аўхачоў ад радавога байца вырас да маёра. Ён камандаваў трэцім танкавым батальёнам, прайшоў з баямі разам з польскімі сябрамі па зброі, вызваляў захопленую ворагам зямлю. Не адну баявую аперацыю правёў танкавы батальён пад яго камандаваннем. Так, у баях за горад Нойштат Аўхачоў вёў сваю машыну наперадзе баявых парадкаў, умела кіраваў батальёнам. Ён зрабіў абходны манёўр. Маючы цеснае ўзаемадзеянне з суседнім стралковым палком, Феадосій Міхайлавіч умела абыйшоў апорныя пункты ворага. З паўночнага боку батальён уварваўся у горад Нойштат, што забяспечыла паспяховае выкананне пастаўленнай баявой задачы.У гэтым баі Аўхачоў асабіста знішчыў гармату праціўніка.

У панядзелак, 5 сакавіка 1945 года, Стаўкай Вярхоўнага Галоўнакамандавання была дадзена дырэктыва камандуючаму войскамі другога Беларускага фронту разбіць праціўніка, авалодаць гарадамі Данцыг і Гдыня, выйсці на ўзбярэжжа Балтыйскага мора. У баях за польскі горад Гдыня ранены афіцэр Аўхачоў не пакінуў поле боя, працягваў камандаваць батальёнам. Феадосій Міхайлавіч праявіў выключную мужнасць і адвагу.

У сераду, 28 сакавіка 1945 года, Ф. М. Аўхачоў разам з усімі воінамі другога Беларускага фронту ўдзельнічаў у штурме горада і порта Гдыня. Польскія сябры па-братэрску сустракалі нашых воінаў-вызваліцеляў на беразе Балтыйскага мора.

Танкавы батальён, якім камандаваў Феадосій Міхайлавіч, за перыяд гэтых аперацый знішчыў дзесяць палявых і адну самаходную гармату, больш 150 гітлераўцаў, захапіў 20 паравозаў, каля ста вагонаў з грузамі праціўніка, 70 павозак з маёмасцю, 30 матацыклаў, каля 350 аўтамашын, некалькі складаў.

За гераізм, адвагу і мужнасць Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР 15 мая 1946 года маёру Феадосію Міхайлавічу Аўхачову было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза. Яго імем названа адна з вуліц у горадзе Касцюковічы.

**Гаўрылаў, І. Мужнасць афіцэра / І. Гаўрылаў // Сцяг камунізма (Касцюковічы). — 1976. — 20 лістапада. — С. 2.**